УДК 930.8

# ПРАБЛЕМА ВЫВУЧЭННЯ ЦАЦКІ І ГУЛЬНЁВАЙ КУЛЬТУРЫ Ў РАСІІ, ПОЛЬШЧЫ І БЕЛАРУСІ

*С.У. КАСЦЮКЕВІЧ*

*Праведзены параўнаўчы гістарыяграфічны аналіз праблемы даследаванасці гульнёвай культуры і цацкі ў беларускай, польскай і рускай літаратуры. На падставе аналізу літаратуры зроблены высновы аб асноўных праблемах у вывучэнні дадзеных феноменаў у рускай, польскай і беларускай этнаграфічнай навуцы. Разгледжана дзейнасць Беларускага цэнтра гульні і цацкі, расійскага Музея цацкі ў г. Загорску, польскага Музея цацкі ў г. Кельцы.*

## Праблемы гульнёвай культуры і цацкі ў кантэксце вывучэння дзіцячай субкультуры

Дзяцінства як самастойны аб'ект вывучэння было выдзелена ў рамантычна-асветніцкай заходнееўрапейскай літаратуры. Доўгі час дзяцінства з'яўлялася прадметам дэтальнага аналіза ў мастацкіх творах класікаў літаратуры: Л. Талстога, Ч. Дзікенса, М. Твена, Ж-Ж. Руссо.

У культуралагічных даследаваннях дзяцінства стала самастойным аб'ектам вывучэння пад ўздзеяннем псіхааналітычнага падыхода, у якім яно з'яўляецца адной з цэнтральных тэм. Галоўным у вывучэнні гісторыі дзяцінства з'яўляецца напрамак «культура-і-асоба» у межах псіхалагічнай антрапалогіі. Дзяцінства разглядаецца як феномен, вывучаючы які можна ўбачыць патаемныя бакі «дарослай культуры» [23]. Перад даследчыкамі паўсталі праблемы паходжання цацкі і гульні, што знаходзяцца па-за межамі працоўнай дзейнасці чалавека. Гульня – ёсць адна з формаў сацыяльнай актыўнасці. У працэсе гульнёвай дзейнасці чалавек набывае веды, затым яны ператвараюцца ў паняцці, ствараючы заіндывідуалізаваны вобраз свята. Менавіта магчымасць выйсці з паўсядзённасці і з'яўляецца тым асноўным, што прываблівае ў гульні. Цацка выступае яе неад'емным атрыбутам.

Цацка і гульня непарыўна звязаны з дзяцінствам і дзецьмі. Для дарослых свет дзіцяці застаецца да канца не разгаданай краінай. Гэты свет нібыта існуе ў бясконцым карнавале. Каб акрэсліць, аддзяліць дзіцячы свет ад дарослага былі ўведзены такія тэрміны, як гульнёвая культура і дзіцячая субкультура.

Сучасную навуку цікавяць ступень уздзеяння ранняга дзіцячага вопыта на дарослага чалавека, залежнасць сямейнага выхавання ад сацыяльных умоў і г.д. Першыя ж сур'ёзныя доследы паказалі, што дзеці – зусім не маленькія дарослыя і што іх фальклор, побыт якасна адрозніваецца ад таго, які ёсць у дарослых. Больш шчыльнае знаёмства з дзіцячай субкультурай настолькі ўразіла даследчыкаў, што яны пачалі гаварыць аб адкрыцці «племені дзяцей» са своеасаблівай культурай. Вялікую ролю ў гэтых пераменах адыгралі працы вядомага антраполага М. Мід. Яна прыйшла да высновы, што іншае бачанне света, іншы вопыт яго спасціжэння з'яўляецца асновай для ўзнікнення новых субкультур – субкультур падрастаючага пакалення [28, с. 43]. Пачала развівацца новая навука – «этнаграфія дзяцінства», якая разглядала дзяцей як спецыфічны субэтнас у межах розных этнасаў света. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што «дзіця не заўсёды з'яўляецца простай мініятурная копіяй з дарослага, што яно ў многіх адносінах адрозніваецца, прадстаўляе зусім іншую, асаблівую істоту» [28, с. 56].

У дарэвалюцыйнай Расіі першымі этнографамі-збіральнікамі, якія вылучылі дзіцячы фальклор у асобы раздзел народнай творчасці, былі П. Шэйн, А. Кіркор [27]. Сучасны погляд на дзіцячую субкультуру сфарміраваўся ў асноўным у 50 – 60 гады XX ст., калі ў розных краінах узнік «культ дзяцінства» і ўзрос інтарэс да дзіцячай творчасці. Гэты інтарэс нарадзіў новыя метады збора матэрыяла, блізкія да этнаграфічных палявых доследаў: уключанаеназіранне з магнітафонным запісам і фотаздымкамі, інтэрв'юіраванне і масавыя апытанні, методыкі кадзіравання гульняў, картаграфіраванне распаўсюджанасці фальклорных сюжэтаў і г.д. [6] У апошнія гады з'явіліся таленавітыя даследчыкі, якія прысвяцілі сябе вывучэнню дзіцячай субкультуры. Напрыклад, М. Асорына [32] правяла некалькі самастойных даследаванняў гэтага феномена.

Не існуе этнічнай культуры, якая была б пазбаўлена гульнёвай культуры і цацкі, можна заўважыць у іх шэраг інтэрнацыянальных рысаў. Пры гэтым шмат аўтэнтычных элементаў, якія вызначаюць адметнасць гэтых з'яў у культуры народа. Беларуская народная цацка – цікавая і шматгранная з'ява народнай культуры. Разам з тым, яе нельга ўявіць без сувязі з падобнымі з'явамі ў культуры суседніх народаў. Найбольш уплывовымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца культуры бліжэйшых суседзяў-славян: з усходу – рускіх, з захаду – палякаў.

Багацце сабранага фактычнага матэрыяла па гульнёвай дзейнасці і цаццы дазваляе даследчыкам разглядаць розныя іх праявы. Застаюцца пэўныя аспекты дадзеных з'яў, якія разгледжаны недастаткова. У параўнанні з такімі краінамі, як Расія, Францыя, Германія, Англія, Бельгія, ЗША, Данія, дзе функцыянуюць навуковыя інстытуты з моцнымі традыцыямі па вывучэнню гульнёвай дзейнасці і цацкі,

на Беларусі сітуацыя больш сціплая. У беларускай гістарыяграфіі па дадзенай праблеме існуе шэраг недахопаў. Прабелы ў літаратуры, прысвечанай гульнёвай культуры і цаццы, заўважныя, калі размова ідзе аб параўнаўчай характарыстыцы беларускай цацкі і цацкі суседніх народаў. Бракуе доследаў па вывучэнню гульнёвай культуры і цацкі памежных рэгіёнаў, таксама недастае абагульняючых прац. Часцей за ўсё літаратура па дадзенай праблематыцы носіць галіновы характар. Аналіз праблемы паказвае, што ўвесь комплекс літаратуры можна падзяліць на чатыры ўмоўныя раздзелы:

1) гістарычна-этнаграфічны;
2) тэхніка-тэхналагічны;
3) педагагічна-псіхалагічны;
4) мастацказнаўчы.

Гэты падзел аднолькава ўжывальны і для рускамоўнай, і для польскамоўнай, і для беларускамоўнай літаратуры. Трэба заўважыць, што для дадзенага артыкула ў якасці крыніц ужывалася перш за ўсе літаратура, дзе акрэслівалася праблема цацкі і гульні як элемента дзіцячай гульнёвай культуры.

**Агляд расійскай гістарыяграфіі**

У расійскай гістарыяграфіі тэма цацкі і гульні пачала распрацоўвацца на хвалі агульнай цікавасці да побыту народа на мяжы XIX – XX стст. Трэба зазначыць апісальны характар прац гэтага перыяду, вельмі рэдкімі з'яўляліся аналіз ці абагульненне. Дзіцячая культура этнографамі амаль не заўважалася, альбо ўзгадвалася ў кантэксце апісання быта дарослых. Напрыклад, М. Ануфрыеў [30], І. Гаптарэўскі [17], А. Горбач [18] апісвалі, як даглядалі, гадавалі і выхоўвалі сялянскіх дзяцей, а таксама дзіцячыя гульні. У літаратуры адсутнічаў аналіз і крытычны падыход. Сітуацыя з вывучэннем дзіцячай культуры змяняецца, калі па ініцыятыве энтузіястаў ствараецца Музей цацкі ў г. Загорску [37]. Музей цацкі стаў цэнтрам вывучэння цацкі ў Расіі, пры ім выдаецца шмат этнаграфічнага матэрыялу па культуры дзяцей і цаццы. З'яўляецца цэлая група даследчыкаў народнай цацкі. Працы іх носяць комплексны характар, сумяшчаюцца псіхолага-педагагічныя і гістарычна-этнаграфічныя доследы. Да ліку такіх даследчыкаў адносяцца Л. Аршанскі [31], В. Баруцкі [13], Н. Бартрам [26, с. 7], С. Глаголь [13], якія шмат зрабілі для вывучэння гісторыі рускай народнай цацкі. Пазітыўна тое, што кола літаратуры пашыралася за кошт перакладаў замежных аўтараў, перш за ўсё ў псіхолага-педагагічнай сферы. У навуцы таго часу пануе думка, што дзіцячая псіхалогія падобна да псіхалогіі людзей «прымітыўных» грамадств: А. Бакушынскі [4], В. Харузіна [43], Н. Цэрэтелі [45].

Шмат цікавага матэрыялу па рускай народнай цаццы сабраў Л. Дзінцес [23], пры гэтым ён даваў вельмі грунтоўны аналіз дзейнасці сваіх папярэднікаў, акрэсліваў праблемы, якія ў вывучэнні цацкі застаюцца актуальнымі і сёння, у некаторых сваіх працах разглядаў цацку як элемент народнага мастацтва. Аб адной з першых яго прац хацелася б расказаць падрабязней. Яе назва: «Русская глиняная игрушка, происхождение, путь исторического развития» [23]. У манаграфіі апісваецца руская народная гліняная цацка ад ўзнікнення да XX ст. Аўтар выказвае сваё меркаванне наконт паходжання цацкі. Л. Дзінцес выкарыстоўвае пры трактоўцы сюжэтаў народнай цацкі міфалагічныя тэмы. З'яўленне ў рускай цаццы так званых «полканов» (выявы напаўканя-напаўчалавека ) звязвае з салярнымі культамі і лічыць ўвасабленнем адзінства прыроды і чалавека. Такім чынам, у працах даследчыка з'яўляецца крытычны падыход. Гэта быў значны крок наперад для расійскай гістарыяграфіі па дадзенай праблеме.

Пры Музеі цацкі існавала камісія па дзіцячых цацках. Яна выдавала зборнікі прац, прысвечаных розным аспектам гульнёвай культуры, што спрыяла паглыбленню праблемы. Акрамя мастацказнаўчага, псіхолага-педагагічнага, этнаграфічна-гістарычнага, для працы камісіі па дзіцячых цацках важным стаў тэхналагічны аспект. Тэхналогія вырабу цацкі, гігіенічныя і медыцынскія патрабаванні да яе ўпершыню зрабіліся аб'ектам вывучэння. Знаўцы народнай цацкі распрацоўваюць шэраг патрабаванняў для прамысловага вырабу цацак, паводле якіх прадметы гульні павінны адпавядаць не толькі педагагічным, але і медыцынскім патрабаванням. Даваліся карысныя парады не толькі па вырабу цацак, але і па кіраванню дзіцячымі гульнямі, гурткамі. Вынікі дзейнасці камісіі адлюстраваны ў зборніку «Труды комиссии по детским игрушкам» [2], які выйшаў пад рэдакцыей М. Рыбнікава.

Наступны этап у вывучэнні гульнёвай культуры і цацкі звязаны з актыўным вывучэннем цацкі як часткі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва рускага народа. Гэты этап характарызуецца добрай распрацаванасцю мастацтвазнаўчага і тэхналагічнага аспектаў. Па часе гэта дастаткова працяглы перыяд, ён займае 40 – 80-я гады XX ст. Руская народная цацка характарызуецца тым, што яна мела ярка выяўленыя цэнтры вырабу, такія як Дымкава, Хахлама і г.д. Даследчыкі, апісваючы гэтыя цэнтры, распрацоўвалі праблемы тэхналогіі, паходжання, мастацкай каштоўнасці цацкі. Напрыклад, І. Багуслаўская [12], Г. Дайн [21] звяртаюць увагу перш за ўсё на дэкаратыўнае афармленне цацкі і яе сімволіку. У той час як Л. Дзінцес [23], Л. Дыяканаў [24], Н. Півен [33] больш увагі надаюць асаблівасцям вырабу і роспісу цацак у розных цацачных асяродках.

Е. Мажаева [29] апісвае адзін від народнай цацкі – цацачных коней. Яе манаграфія прысвечана апісанню ролі цацкі ў народнай культуры і сучаснаму стану народнай цацкі. Калекцыяніраванню народнай цацкі і апісанню яе збораў у самым буйным музеі цацкі на тэрыторыі Расіі прысвечана калектыўная праца «Руская игрушка. Из коллекции художественно-педагогического музея игрушки АПН СССР г. Загорск» [37]. Даследчыкі Н. Тараноўская [41], А. Чэкалаў [47] зрабілі акцэнт у сваіх працах на матэрыял для вырабу народнай цацкі. Яны апісалі адну з найбольшых груп народнай цацкі – драўляную цацку. У творах дадзеных аўтараў акрэслены шырокі дыяпазон бытавання драўлянай цацкі: з поўдня на поўнач і з захаду на ўсход.

Педагагічнаму аспекту ў рускай народнай цаццы прысвяціла сваю працу Е. Флёрына [42], яна звярнула ўвагу на выхаваўчае значэнне цацкі і на народныя традыцыі вырабу цацкі.

Шмат літаратуры прысвячалася мастацкаму афармленню быта, а цацка разглядалася як дэкаратыўны элемент. Гэта звязана перш за ўсё з частковай стратай народнай цацкай сваёй гульнёвай функцыі і ператварэннем яе ў від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гэта была аб'ектыўная з'ява, паколькі фабрычная прадукцыя выцясняе з ужытку саматужныя вырабы. Народная цацка страчвае сваё гульнёвае прызначэнне і становіцца сувенірам. Ва ўжытак усё часцей уваходзіць такі тэрмін, як «дробная пластыка», які часам падмяняе слова «цацка». Напрыклад, даследчыкі А. Абросімаў [1], М. Берштэйн [11], В. Барадулін [5], А. Чэкалаў [47] ужываюць менавіта гэты тэрмін. Недахопам літаратуры падобнага роду з'яўляецца тое, што яна часта новыя сюжэты трактуе як народныя. Для літаратуры ў 70 – 80-я гады XX ст. характэрна, што ненадавалася належнай увагі розніцы паміж сапраўды народнымі вырабамі і вырабамі ўмельцаў. У цаццы назіраецца размыванне межаў паміж традыцыйнай цацкай і прамысловымі вырабамі, што не ішло на карысць захаванню аўтэнтычных рысаў.

Вельмі важным аспектам расійскай гістарыяграфіі, прысвечанай гульнёвай культуры і цаццы, з'яўляецца літаратура педагагічнага цыкла, якая датычыцца эстэтычна-педагагічнага выхавання дзяцей, прывіцця навыкаў творчасці, азнаямлення іх з народнымі традыцыямі і г.д. Недахопам дадзенага кола літаратуры можна лічыць слабую апору на этнаграфічныя доследы. Выкарыстоўваецца этнаграфічны матэрыял у рэдкіх выключэннях: І. Баранава, Л. Глякава [6] апісалі матэрыялы Дзяржаўнага музея этнаграфіі народаў СССР, што адносяцца да выхавання дзяцей; Е. Флёрына [42] прысвяціла працу педагогіцы народнай цацкі. На асаблівасці методыкі збірання і апісання дзіцячай культуры і метады вывучэння сучаснага дзіцячага побыту звярнула ўвагу М. Асорына [32]. У 80 – 90-я гады XX ст. вывучэнне дзіцячага побыту стала зноў папулярным. Звярнулі ўвагу і на адраджэнне народнай цацкі. З'явілася значная колькасць якасна новай літаратуры, якая імкнулася да абагульняючых высноў.

Значную частку літаратуры, прысвечанай цаццы, складае мастацтвазнаўчая літаратура. Кола такой літаратуры шырокае: фотаальбомы, каталогі выстаў, зборнікі мастацтвазнаўчых артыкулаў і г.д. Цацка ў гэтым выпадку разглядаецца як від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Руская народная цацка была прадстаўлена на шматлікіх выставах, дзякуючы сваім дэкаратыўным якасцям яна стала візітнай карткай асобных рэгіёнаў Расіі, што дало падставу для яе апісання, распрацоўкі праблем, звязаных з цацкай і гульнёвай культурай. Перш за ўсе трэба адзначыць тут такія працы, як «Рускае дэкаратыўнае мастацтва» у 3 т. [38] і інш.

Вельмі значны ўнёсак у распрацоўку праблем, звязаных з цацкай ў мастацтвазнаўчым і гісторыка-этнаграфічным аспектах, зрабіў акадэмік Б. Рыбакоў [39]. Шэраг прац даследчыка прысвечаны старажытнаму мастацтву і трактоўцы яго сюжэтаў праз славянскую міфалогію. Значную ўвагу акадэмік надае ў сваіх манаграфіях архаічным элементам цацак.

У 90-я гады XX ст. – пачатку XXI ст. назіраецца зноў павелічэнне цікавасці да народнай культуры ўвогуле і да народнай цацкі ў прыватнасці. Сталі з'яўляцца публікацыі, прысвечаная дзіцячай культуры і цаццы, у якіх на новым узроўні аналізуюцца ўжо вядомыя факты. Папулярнасць у расійскай гістарыяграфіі апошніх гадоў набылі некаторыя канцэпцыі сучаснай культурнай антрапалогіі. Аб'ектам вывучэння стала гульнёвая культура і яе генезіс. Найбольш адметны ў дадзеным напрамку працы М. Асорынай [32]. Канцэпцыя антраполага накіравана на ўсведамленне сутнасці дзіцячай гульнёвай культуры, а значыць – глыбейшае пранікненне ў сутнасць цацкі як яе з'явы.

Адзначым наступныя высновы зыходзячы з вышэйпрадстаўленага аналіза расійскай літаратуры па праблематыцы гульнёвай культуры і цацкі:

1) багаты фактычны матэрыял, сабраны расійскімі даследчыкамі народнай цацкі, дазволіў перайсці ў вывучэнні гэтай з'явы на новы этап – стварэння канцэпцыі развіцця гульнёвай культуры і цацкі ў Расіі;

2) прычыны добрай распрацаванасці праблемы носяць аб'ектыўны характар. Руская народная цацка мае яркія самабытныя асяродкі вырабу, якія прыцягвалі ўвагу даследчыкаў;

3) цэнтрам вывучэння і збірання рускай народнай цацкі да сённяшняга дня з'яўляецца Мастацка-педагагічны музей цацкі ў г. Загорску.

**Агляд польскай гістарыяграфіі**

У польскай літаратуры цікавасць да праблем гульні і цацкі праяўляецца ў розных аспектах: педагагічным, этнаграфічным, псіхалагічным, тэхнічным і г.д. З найбольш цікавых польскіх даследчыкаў трэба адзначыць тых, хто стаяў на пачатку вывучэння цацкі як з'явы народнай культуры, гэта этнографы С. Удзела, А. Чэнтнік, Т. Севярын [53, с. 2]. Працы даследчыкаў звязаны з практычнай дзейнасцю Цэнтра народных промыслаў. Функцыянаванне Цэнтра дазволіла не толькі эфектыўна каардынаваць продаж цацачнай прадукцыі на мясцовых рынках, але таксама забяспечваць экспартныя патрэбы. Дзейнасць ўстановы стала вызначальнай для пачатку XX ст. у галіне народных промыслаў. Збіраннем этнаграфічнага матэрыялу ў пачатку XX ст. займаўся Кракаўскі этнаграфічны музей. Там захоўвалася самая вялікая ў Польшчы калекцыя народнай цацкі на той час. Ініцыятарам складання калекцыі стаў першы дырэктар музея Севярын Удзела, імя якога зараз носіць дадзеная музейная ўстанова [53].

Самай папулярнай і вядомай у Польшчы працай па праблеме паходжання і эвалюцыі народнай цацкі з'яўляецца манаграфія Я. Буяка «Цацкі ў Еўропе» [49].

Неабходна звярнуць увагу таксама на вельмі каштоўную працу па музейнаму вывучэнню цацачнай прадукцыі аўтарскай суполкі Я. Буяка і Б. Пілічоўскай [49]. Яна з'яўляецца шырокім разглядам і характарыстыкай цацкі, пабудаванай па тэрытарыяльнаму прынцыпу, дзе разгледжаны цацкі Англіі, Расіі, Францыі, Польшчы і іншых краін, значная ўвага нададзена аўтарамі выставам і конкурсам, на якіх прадстаўлены цацкі, калекцыянерскай працы, характарыстыцы навукова-даследчай дзейнасці іх папярэднікаў у гэтым напрамку і г.д.

Карысныя педагагічныя парады і элементы з гісторыі пахождання цацкі ўтрымліваюць артыкулы Т. Лявіньскай [54], М. Рынкоўскага [55], дзе цацка разглядаецца ад старажытных конікаў, птахаў, зробленых з дрэва, да сучасных механічных цацак. Цікавая праца Е. Пясецкага, выдадзеная ў зборніку «Веды аб Польшчы» [54], у ёй аўтар аналізуе народныя гульні і цацкі, існаваўшыя ў краіне ў XIX – XX стст.

Некаторыя даследчыкі, вывучаючы літаратуру па цаццы і гульнёвай культуры, адзначаюць, што існаваў недахоп польскай літаратуры ў галіне тэхнікі, тэхналогіі, тавараразнаўства і эканомікі ў дачыненні цацкі [52, с. 11]. У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. гэтая «ніша» была запоўнена працамі Р. Зензіо [57], Р. Кантара [56], У. Кашмарэк [52], Л. Дзіенгела [50], М. Аляшкевіч [53] і інш. Для польскамоўнай гістарыяграфіі па дадзенай праблематыцы характэрна тое, што нельга строга вылучыць, да якога раздзела гуманітарнай навукі належыць тая ці іншая манаграфія. Часцей за ўсё аўтары аналізуюць цацку як комплексную з'яву, спалучаючы гістарычны, педагагічны, этнаграфічны і іншыя аспекты.

Для польскай гістарыяграфіі па праблеме цацкі характэрна істотная акалічнасць: публікацыі ў літаратуры адрозніваюцца надзённасцю, вырашаюць праблемы, звязаныя з ужываннем народных цацак у выхаваўчым працэсе. Без увагі не застаюцца праблемы віртуальных гульняў, іх псіхалагічнага ўздзеяння на чалавека, праблемы стасункаў традыцыі і трансфармацыі ў сучасную гульнёвую культуру традыцыйных рысаў. Пытанням уплыву на дзіцячую псіхіку камп'ютэрных гульняў прысвяцілі свае артыкулы І. Кабзіньская [51], М. Рынкоўскі [55].

Сучасным цэнтрам вывучэння цацкі і побыту дзяцей з'яўляецца Музей цацкі ў Кельцах, створаны ў 1979 годзе. Калекцыі музея скамплектаваны за кошт падараванняў музееў свету, Кракаўскага этнаграфічнага музея і прыватных асоб. Ёсць у музеі і калекцыі рускай, украінскай і беларускай народнай цацкі. Вакол гэтай установы групуюцца ўсе зацікаўленыя праблемамі цацкі і гульнёвай культуры асобы: навукоўцы, майстры, мастакі, педагогі. Музей рэгулярна праводзіць фестывалі майстроў-цацачнікаў, вядзе даследчую, збіральніцкую і выхаваўчую працу.

Асноўная колькасць матэрыялаў, прысвечаных гульне і цаццы ў Польшчы, выходзіць у трох перыядычных выданнях. На працягу многіх гадоў выдаюцца бюлетэнь «Экспрэс-інфармацыя ОБР» у Лодзі і «Доследы і матэрыялы» у Кельцах. Грунтоўным выданнем з'яўляецца квартальнік «Цацкі і гульні». Ён прысвечаны праблематыцы культурнай ролі цацкі і гульні ў чалавечай супольнасці. У выданні праблема разглядаецца на памежжы розных навуковых дысцыплін, што дае магчымасць убачыць яе больш аб'ёмна. Адной з мэт квартальніка з'яўляецца наданне ўвагі грамадскасці праблемам мясцовай вытворчасці цацак, распаўсюджвання народных гульняў і забаў сярод насельніцтва. Выдаўцы разам з тым падкрэсліваюць навуковы характар матэрыялаў часопіса. Па падліках Р. Кантора, на працягу апошніх дзесяці год у Польшчы выйшла каля 240 артыкулаў, якія датычацца цацкі, цацачных промыслаў і гульнёвай культуры [56, с. 142]. Большасць з гэтых публікацый мае спадарожны характар і суправаджае рознага кшталту музейныя і артыстычныя імпрэзы, з'езды, сустрэчы майстроў-цацачнікаў, нарады навукоўцаў, гандлёвыя з'езды і таргі, прадметам якіх з'яўляюцца цацкі.

Гульня і цацка разглядаецца ў шырокім грамадскім і эканамічным кантэксце. Часта публікуюцца артыкулы аб цаццы ў наступных газетах і часопісах: «Агляд», «Грамадская праца», «Сяброўка», «Кабета і жыццё», «Сцэна», «Перамены», «Люстэрка», «Кулісы», «Стандарт маладых», «Эха дня», «Слова люду», «Выбарчая газета». Найбольшая колькасць публікацый звязана з буйнымі падзеямі ў свеце вывучэння гульнёвай культуры і цацкі: утварэннем Музея цацкі ў Кельцах, выставе цацак у Этнаграфічным музеі

горада Кракава, Міжнародным фестывалем лялькі ў Бельску-Бялым, выставах лялек у музеях Лодзі, рэгіянальнай выставе «Лялькі света» і г.д.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што:

1) актыўнае этнаграфічнае вывучэнне цацкі і гульнёвай культуры ў Польшчы пачалося з пачатку XX ст. у Кракаўскім этнаграфічным музеі;

2) найбольш плённы перыяд у вывучэнні цацкі адносіцца да канца XX ст. і звязаны з дзейнасцю Музея цацкі ў Кельцах;

3) асяродкі вырабу польскай цацкі сталі галоўным прадметам цікавасці даследчыкаў;

4) польскія даследаванні па праблемах цацкі і гульнёвай культуры носяць міждысцыплінарны характар.

**Агляд беларускай гістарыяграфіі**

Першыя творы, у якіх закранаюцца праблемы гульнёвай культуры і цацкі Беларусі, з'яўляюцца ў канцы XIX – пачатку XX стст. На дзіцячую гульню і цацку звярнулі ўвагу этнографы-даследчыкі М. Ануфрыеў [30], П. Дземідовіч [22], А. Кіркор [27], Л. Чарняўская [46], В. Харузіна [43] і інш.

Некаторыя матэрыялы аб вырабе цацак, доглядзе за немаўлятамі і казках на Беларусі ўтрымліваюцца ў выданнях «Жывой старыны» [22], а таксама кніжцы А. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў: Этнаграфічны нарыс» [3] і г.д.

Агульнай характарыстыкай літаратуры дадзенага перыяду з'яўляецца фрагментарнасць у даследаванні праблемаў гульнёвай культуры і цацкі, недасканаласць іх распрацоўкі і выпадковы характар публікацый. Займаліся этнографы і зборам калекцый цацак яшчэ ў XIX ст. Нажаль, яны былі ці знішчаны, ці вывезены за мяжу. Значная частка калекцый беларускай народнай цацкі, сабраных А. Сержпутоўскім, Е. Раманавым, І. Акімавым, Н. Лебедзевым, А. Мілерам, знаходзіцца зараз у Расійскім этнаграфічным музеі ў Санкт-Пецярбургу.

Шмат увагі ўдзяліў збіранню і вывучэнню фізічных гульняў Я. Вількін [14]. Акрамя пытанняў гісторыі народных гульняў, іх арганізацыі і класіфікацыі, фізічнай культуры беларусаў, ім даследавана 300 варыянтаў гульняў, зафіксаваны шматлікія тэксты «лічылак», дзіцячых песень, «дразнілак». Даследчыкам выдадзены невялікі зборнік гульняў для дзяцей.

У 50 – 80-я гады XX ст. папулярнасць набылі зборнікі матэрыялаў для працы з дзецьмі ў дзіцячым садзе, аўтарамі і складальнікамі іх былі М. Гершэнзон [15], З. Ермакова, В. Шыбека [9] і інш. Адна істотная акалічнасць характэрна для вышэйазначанай літаратуры – яна арыентавана на практычнае прымяненне кіраўнікамі гурткоў, студый і г.д. Гэта, безумоўна, добра. Але існуе недахоп тэарэтычных прац. Калі ж такія працы і ёсць, то яны датычацца перш за ўсё тэатра, мастацкай самадзейнасці. Рознымі аспектамі гульнёвых жанраў займаліся і займаюцца М. Грынблат, П. Гуд, В. Гусеў, К. Кабашнікаў, В. Ліцвінка, З. Мажэйка, С. Місько, В. Сакалова, Л. Салавей, А. Фядосік, В. Ялатаў і інш. Шмат запісаў гульнёвага фальклора ў архівах Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора НАН Беларусі, вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Звяртаецца да праблем гульні ў традыцыйнай педагогіцы беларусаў Л. Ракава [35]. У яе кнізе, дзе аналізуюцца традыцыйныя формы, метады і сродкі выхавання дзяцей у беларусаў, у раздзеле «Гульні і забавы ў выхаванні дзяцей» даецца ўзроставая характарыстыка гульняў, а таксама агульная характарыстыка дзіцячых цацак XIX – пач. XX стст.

Вывучэнне беларускай цацкі мела эпізадычны характар у савецкай літаратуры, і толькі ў 90-я гады XX ст. да яе назіраецца павышэнне цікавасці даследчыкаў. Пачалі з'яўляцца публікацыі асобных аўтараў па гэтай тэматыцы. Пры разглядзе цацкі акцэнты рабіліся перш за ўсё на яе мастацкія якасці, матэрыял і тэхналогію вырабу. Недастаткова ўвагі ўдзялялася яе асноўным функцыям, стасункам цацкі з гульнёвай дзейнасцю дзяцей.

Звычайна ў літаратуры падзел цацак ідзе паводле матэрыяла, з якога тыя выраблялiся. Такі ўмоўны падзел прынялі даследчыкі Я. Сахута [40] і М. Ржавуцкі [36]. У працах Я. Сахуты цацка разглядаецца як з'ява дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якой праявіліся асноўныя законы і заканамернасці развіцця гэтай галіны мастацкай культуры.

Даследчык звяртае ўвагу перш за ўсё на дэкаратыўныя асаблівасці цацкі, аднак разглядае і гісторыю развіцця беларускай народнай цацкі, міфалагічныя сюжэты, увасобленыя ў дадзенай з'яве народнай культуры. Такім чынам, аўтар надае цаццы як частцы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі значную ролю.

Цікавай з'яўляецца манаграфія М. Ржавуцкага [36]. У ёй аўтар разглядае гліняную цацку, асаблівую ўвагу звяртае на гісторыю паходжання цацкі, асноўныя яе сюжэты. Каштоўнасць кнігі ў тым, што яна можа выкарыстоўвацца не толькі навукоўцамі, ці тымі хто цікавіцца глінянай цацкай, але і ў якасці метадычных рэкамендацый па вырабу цацкі майстрамі-цацачнікамі, ці метадыстамі дзіцячых гурткоў народнай творчасці. Блізкай у гэтым сэнсе з'яўляецца кніга Т. Церашковіч [44]. Яна прызначана для бацькоў і дзяцей, выхавацеляў і выхаванцаў гурткоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Аўтарам

распрацаваны дапаможнік, у якім прапануюцца ўзоры лялек, выкананых у тэхніцы «мяккай цацкі». Асаблівая ўвага звярнута на касцюм лялькі: адзенне распрацавана паводле беларускіх народных строяў, а цацкі – паводле беларускіх народных казак, абрадаў, звычаяў. На ўсе лялькі прапанаваны выкрайкі і падрабязнае апісанне іх выканання.

Некаторыя цікавыя звесткі аб глінянай цацке ўтрымліваюцца ў манаграфіях, выдадзеных яшчэ ў 60 – 80 гады XX ст. і прысвечаных беларускай народнай кераміцы, гэта кнігі І. Елатамцавай [25], Я. Сахуты [40]. Такім чынам, у беларускай гістарыяграфіі цацка разглядаецца ў асноўным як выхаваўчы сродак, мастацкая з'ява, археалагічная і этнаграфічная знаходка. Звяртаецца ўвага на цацку і ў калектыўных працах, энцыклапедычных выданнях, такіх як «Гісторыя беларускага мастацтва» у 6 т. [16], «Беларусы: Прамысловыя і рамесныя заняткі» [10], «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» [48] і інш. У такіх выданнях дадзеныя аб цаццы вельмі кароткія, што супадае з іх мэтамі – даць кароткія, дакладныя звесткі аб той ці іншай з'яве.

У 90-х гадах XX ст. выйшлі артыкулы па гульнёвай культуры і беларускай народнай цаццы А. Дабравольскай [20], Л. Ракавай [35], у якіх звяртаецца ўвага на педагагічны аспект і ролю цацкі ў выхаванні дзяцей канца XIX – пачатку XX стст., М. Плавінскага [34], дзе цацка разглядаецца як археалагічная знаходка.

Такім чынам, праблемы паходжання цацкі і гульнёвай культуры разглядаюцца як бы мімаходзь, як спадарожныя іншай праблематыцы. Калі ж разглядаецца цацка як асобная з'ява, то падкрэсліваецца толькі адзін аспект. Гэты недахоп паспрабавалі выправіць арганізатары і супрацоўнікі Беларускага навукова-метадычнага цэнтра гульні і цацкі (БЦГЦ). Цяжка пераацаніць яго ролю ў галіне ўзбагачэння кніжнага рынка літаратурай, прысвечанай гульнёвай культуры.

БЦГЦ з'яўляецца рэспубліканскай навукова-метадычнай установай з эксперыментальнай вытворчасцю ў сістэме Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь. Створаны 1 лютага 1992 года. У Цэнтры працуе каля 20 супрацоўнікаў: навукоўцы і метадысты, педагогі, мастацтвазнаўцы, этнографы, інжынеры-канструктары, мастакі і майстры-цацачнікі. У комплекс БЦГЦ уваходзяць навукова-метадычная і вытворчая лабараторыя, дзіцячы сад № 376 як эксперыментальная пляцоўка, стварающца музейныя і гульнёвыя залы, майстэрні цацак, гульнятэка, крама [8].

БЦГЦ падтрымлівае сувязь з прадпрыемствамі, якія вырабляюць гульні і цацкі, скіроўвае іх працу на стварэнне высокаякаснай гульнёвай прадукцыі для дашкольных, школьных, пазашкольных спецыяльных устаноў. БЦГЦ стварае новыя ўзоры цацак і гульняў для вытворчасці. На базе Цэнтра працуе міжведамственная Рэспубліканская камісія па цацках (РКЦ), якая рэкамендуе ўзоры-эталоны для масавага выпуску цацак. Сябры РКЦ – прадстаўнікі розных міністэрстваў і ўстаноў культуры. БЦГЦ збірае экспанаты для будучага рэспубліканскага педагагічнага музея: археалагічныя і архіўныя знаходкі, традыцыйныя і сучасныя цацкі і гульні; арганізуе кірмашы, фестывалі, канферэнцыі, семінары, выставы. БЦГЦ з'яўляецца адной з вядучых устаноў, якая аб'ядноўвае намаганні навукоўцаў і практыкаў па праблемах гульнёвай дзейнасці. БЦГЦ выпусціў шэраг дапаможнікаў: «Ехала Каляда ў чырвоным вазочку...» (1992 г.); «Беларусазнаўства» (1992 – 1994 гг.); Т. Церашковіч «Лялька беларуская» (1992 г.); Т. Церашковіч «Рукадзельніца» (1992 г.); А. Лозка «Беларускі народны каляндар» (1993 г.) ; «Восеньскія святы» (1995 г.) [8, с. 54 – 58].

Крокам наперад у вывучэнні гульні і цацкі стала распрацоўка канцэпцыі развіцця гульні і цацкі ў Беларусі [8, с. 49 – 53]. Мэтай працы БЦГЦ стала вызначэнне і абгрунтаванне накірункаў развіцця і абнаўлення гульняў, цацак і гульнёвага абсталявання для навучальна-выхаваўчых устаноў Рэспублікі Беларусь. Адзначана, што канцэптуальная мадэль гульні і цацкі грунтуецца на дзейнасным, асабовым і сістэмна-цэласным падыходах. За аснову прыняты палажэнні аб тым, што спецыфіка нацыянальнай сістэмы выхавання заключаецца ў выкарыстанні нацыянальных традыцыйных педагагічных прыёмаў і аўтэнтычных цацак і гульняў.

У Цэнтры падрыхтаваны дыяфільмы: «Старадаўнія цацкі» (1994 г.); «Беларускія млыны, або як і чым робіцца мука для булак» (1994 г.); «Бабуліна аптэка» (1995 г.); «Што ведае дзед Батлейкавед» (1995 г.); дакументальныя кінафільмы: «Восень на Палессі» (1994 г.); кіначасопіс «Беларускі цэнтр гульні і цацкі» (1995 г.) [8, с. 34].

Значную цікавасць прадстаўляе кніга, выдадзеная Цэнтрам «Беларуская цацка і гульня. Матэрыялы ў дапамогу стваральнікам цацак і гульняў на аснове беларускага народнага мастацтва, этнаграфіі і фальклора» [8]. У ёй аўтары даюць добрыя парады для стваральнікаў цацак, абапіраючыся на беларускія народныя традыцыі.

У 1996 г. выйшаў зборнік «Гульні, забавы, ігрышчы» [19]. У выданні ўвага звернута на класіфікацыю беларускіх народных гульняў, уключаны тэксты гульняў, якія адсутнічаюць ў папярэдніх кнігах серыі «Беларуская народная творчасць». Пры падачы тэкстаў аўтары імкнуліся захаваць стыль інфарматараў, іх мову. Як адзначаюць самі даследчыкі гульнёвы матэрыял мае ў навучальным і выхаваўчым працэсе сучаснай школы неацанімае значэнне.

Такім чынам, агляд беларускай гістарыяграфіі па праблемах гульнёвай культуры і цацкі дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1) шэраг фактараў (уваходжанне Беларусі ў склад Расійскай Імперыі, а потым – СССР) перашкаджаў дэтальнай распрацоўцы яе нацыянальных культурных з'яў, адной з якіх была народная цацка;

2) у параўнанні з рускай і польскай беларуская народная цацка не настолькі яркая з'ява, таму даследчыкі рэдка звярталі ўвагу на яе. Не было асяродкаў вырабу беларускай народнай цацкі, што не давала падстаў для яе актыўнага вывучэння;

3) накоплены фактычны матэрыял чакае абагульнення ў навуковых працах. Значная роля ў апрацоўцы этнаграфічнага матэрыяла па гульнёвай культуры і цацкі належыць Беларускаму цэнтру гульні і цацкі.

Падводзячы вынік агульнаму агляду літаратуры па праблематыцы гульнёвай культуры і цацкі ў Расіі, Польшчы і Беларусі, можна зрабіць наступныя высновы:

1) як у беларускай, так і ў рускай і польскай гістарыяграфіі прысутнічае дастаткова шырокае кола літаратуры, прысвечанай гульнёвай культуры і цацке. Аднак, аналізуючы паўнату даследаванасці дадзеных з'яў, цяжка сказаць, што яны вывучаны вычарпальна;

2) гульнёвае дзеянне як элемент сацыяльнай актыўнасці традыцыйнага і сучаснага грамадства найбольш поўна разглядаецца рускімі даследчыкамі. У беларускамоўнай літаратуры пры добрай распрацаванасці праблем гульні ў традыцыйнай культуры, бракуе доследаў сучаснай дзіцячай гульнёвай культуры. Польскамоўная літаратура звернута, наадварот, на сучасную гульнёвую культуру;

3) агульнай характарыстыкай для ўсяго разгледжанага кола літаратуры з'яўляецца тое, што праявы гульнёвай культуры, якія знаходзяцца на памежжы розных навуковых дысцыплін, выпадаюць з-пад увагі даследчыкаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Абросимов А.А. Художественная резьба по дереву и рогу. – М.: Наука, 1984. – 112 с.
2. Андреева М.П. Строительный материал // Труды комиссии по детским игрушкам. Центр педагогическ. институт. Вып. 2 / Под ред. Н.А. Рыбникова. – М., 1922. – 110 с.
3. Багдановіч А.Я. Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў: Этнаграфічны нарыс. – Мн.: Вышэйшая школа, 1995. – 168 с.
4. Бакушинский А.В. Искусство детей // Искусство детей: Сб. – Л., 1935. – С. 32 – 42; Бакушинский А.В. Худ. творчество и воспитание. – М., 1922. – 34 с.
5. Барадулин В.А. Художественная обработка дерева. – М.: Искусство, 1986. – 124 с.
6. Баранова И.И., Глякова Л.Ф. Материалы по детству и воспитанию в коллекциях ГМЭ народов СССР по русской этнографии // «Мир детства» в традиционной культуре народов СССР: Сб. науч. тр. / Под ред. А.Б. Островского, И.И. Баранова. – Л., 1991. – Ч. 2. – С. 5 – 29.
7. Бартрам Н.Д. Игрушка – радость детей. Значение игрушки. Самодельные игрушки. Описание игрушки. – М., 1912. – 144 с.; Избранные статьи. Воспоминания о художнике. – М.: Советский художник, 1979. – 173 с.
8. Беларуская цацка і гульня. Матэрыялы ў дапамогу стваральнікам цацак і гульняў на аснове беларускага народнага мастацтва, этнаграфіі і фальклора / Склад. А.Ю. Лозка, А.К. Лявонава. – Мн.: БЦГЦ. – 57 с.
9. Беларускія народныя гульні ў дзіцячым садзе: Дапаможнік для выхавальніка / Склад. З.І. Ермакова, В.В. Шыбека. – Мн., 1987. – 204 с.
10. Беларусы: У 8 т. / В.К. Бандарчык; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэдкал. В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка. – Мн.: Беларуская навука, 1995. – Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі – 365 с., іл.
11. Бернштейн М.С. Игрушка и ее значение // Ребенок и игрушка: Сб. ст. / Под ред. Н.А. Рыбникова. – М.: Гос. изд-во, 1923. – С. 7 – 12.
12. Богуславская И.Я. Русская глиняная игрушка. – М.: Искусство, 1975. – 142 с.
13. Боруцкий В., Глаголь С., Бартрам Н. Игрушка, ее история и значение: Сб. ст. / Ред. Н.Д. Бартрам. – М.: Изд-во И. Сытина, 1912. – 246 с.
14. Вилькин Я.Р. Белорусские народные игры 2-й пол. XIX – нач. XX вв.: Автореф. дис. … канд. ист. наук. – Мн.: ИИЭФ АН РБ, 1970. – 94 с.; Вількін Я.Р. Беларускія народныя гульні. – Мн.: Беларусь, 1996. – 86 с., іл.; Вількін Я.Р. Беларускія народныя дзіцячыя гульні: Зб. дзіцячых гульняў. – Мн.: Нар. асвета, 1969. – 142 с.
15. Гершэнзон М.А. Вясёлы час: Кніга забаў, самаробак і гульняў. – Мн.: Асвета, 1954. – 84 с.
16. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. / Рэдкал.: В. Марцэлеў і інш. – Мн.: Асвета, 1995. – Т. 1. – 189 с.
17. Гоптаревский И. Надзор за крестьянскими детьми в страдную пору // Гродненские губернские ведомости. – 1905. – № 24.

18. Горбач А.Д. Рысы старога быту ў жыцці беларускіх сялянак у вёсках Шалавічы і Новыя Наборкі Бабаруйскай акругі і вёсках Дразды і Манішава Мозырскай акругі // Наш край. – 1942. – № 3. – С. 46 – 52.
19. Гульні, забавы, ігрышчы / Склад. А.Ю. Лозка. 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 110 с.
20. Дабравольская А. Беларуская народная цацка // Настаўніцкая газета. – 1992. – 23 мая.
21. Дайн Г.Л. Русская народная игрушка. – М.: Легкая и пищевая промышленность, 1981. – 192 с.
22. Демидович П. Белорусские детские игры // Живая старина. Вып. 3, 4. – СПб., 1899. – № 1 – 4, отд. 2. – С. 453 – 462.
23. Динцес Л.А. Древние черты в русском народном искусстве // История культуры древней Руси: Сб. / Под общ. ред. Б.Д. Грекова и М.И. Артомонова. Т. 2: Домонгольский период // Под общ. ред. Н.Н. Воронихина, М.К. Каргера. – М.-Л.: Изд-во Академии наук СССР, 1951. – С. 465 – 491; Динцес Л.А. Русская глиняная игрушка, происхождение, путь исторического развития. – М.-Л.: Изд-во АН СССР, 1936. – 110 с.
24. Дьяконов Л.В. Дымковские глиняные, расписные. – М.: Художник РСФСР, 1965. – 34 с., ил.
25. Елатамцева И.М. Белорусская народная керамика и её традиции в современном декоративно-прикладном искусстве Белоруссии. – Мн., 1966. – 226 с.; Елатамцева И.М. Художественная керамика Советской Белоруссии. – Мн., 1966. – 194 с.
26. // Игрушка, ее история и значение: Сб. ст. / Под общ. ред. Н.Д. Бартрам. – М.: Изд-во тов-ва И.Д. Сытина, 1912. – 245 с.
27. Киркор А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию // ЭС. – СПб., 1858. – Вып. 3. – С. 115 – 276.
28. Мид М. Культура и мир детства: Избр. произведения // Пер. с англ. Ю.А. Асеева. – М.: Наука, 1988. – 429 с., ил.
29. Можаева Е.М. Русские игрушечные кони. Русские сувениры. – М.: Советская Россия, 1976. – 128 с.
30. Онуфриев М. Детские игры у белорусов. Село Хоново Быховского уезда // Могилёвская старина 1902 – 1903 гг. / Под ред. Е.Р. Романова. – Могилёв-на-Днепре, 1903. – Вып. 3. – С. 88 – 94.
31. Оршанский Л.Г. О собирании и изучении детских игрушек как материала для изучения детской психики // Труды I Всероссийского съезда экспериментальной педагогики в Санкт-Петербурге с 26 по 31 декабря 1910 г.; Отчет сост. Н.Е. Румянцевым. Типография П.П. Сойкина. – СПб., 1911. – С. 326 – 338.; Игрушки. Статьи по истории, этнографии и психологии игрушек. – Москва –Петроград, 1923. – 155 с.; Художественное творчество и психологический анализ // Вестник воспитания. – М., 1914. – 190 с.
32. Осорина М. «Черная простыня летит по городу», или зачем дети рассказывают страшные истории // Популярная психология. Хрестоматия. – М.: Прометей, 1990. – 129 с.; Осорина М.В. Секретный мир детей в пространстве мира взрослых. – СПб.: Изд-во Питер, 1999. – 288 с.
33. Пивен Н.А. Липецкая глиняная игрушка // Материалы по этнографии. – Л., 1962. – Вып. 2. – 69 с.
34. Плавінскі М. Мілітарныя цацкі XII – XIII стст. з тэрыторыі Беларусі (да пастаноўкі праблемы) // Гістарычны альманах / Рэд. А. Краўцэвіч, А. Смалянчук, С. Токць. – Мн., 2001. – Т. 5. – С. 149 – 156.
35. Ракава Л.В. Побыт дзяцей у мінулым // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 9. – С. 34 – 35; Ракава Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай весцы. – Мн.: Ураджай, 2000. – 111 с.
36. Ржавуцкі М.С. Беларуская гліняная цацка. – Мн.: Полымя, 1991. – 142 с., іл.
37. Русская игрушка. Из коллекции художественно-педагогического музея игрушки АПН ССР г. Загорск. – М.: Советская Россия, 1987. – 198 с.
38. Русское декоративное искусство. От древнего периода до XVIII в.: В 3 т. – М.: Изд-во Академии художеств СССР, 1962. – Т. 1. – 504 с., ил.
39. Рыбаков Б.А. Из истории культуры Древней Руси: Исследов. и заметки. – М.: Изд-во МГУ, 1984. – 240 с., ил.; Прикладное искусство и скульптура // В кн.: История культуры древней Руси. – М.-Л., 1951. – Т. 2. – С. 396 – 416; Язычество древних славян. – М.: Наука, 1981. – 608 с., ил.
40. Сахута Я.М. Беларускае народнае мастацкае кавальства. – Мн.: Полымя, 1990. – 188 с.; Сахута Я.М. Беларускае народнае мастацтва. – Мн.: Беларусь, 1980. – 154 с.; Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. – Мн.: Полымя, 1996. – 110 с.; Беларуская народная гліняная цацка. – Мн.: Полымя, 1982. – 15 с.; Беларуская народная кераміка. – Мн.: Полымя, 1987. – 112 с.; Народнае мастацтва Беларусі. – Мн.: Беларусь, 1997. – 287 с.; Народнае мастацтва Беларусі: Традыцыі і сучаснасць. – Мн.: Полымя, 1982. – 24 с.; Народная разьба па дрэву. – Мн.: Полымя, 1978. – 23 с.
41. Тарановская Н.В. Русская деревянная игрушка. – Л., 1970. – 212 с.
42. Флёрина Е.А. Педагогика народной игрушки // Игра и игрушка: Сб. – М.: Наука, 1973. – С. 130 – 134.
43. Харузина В.Н. Об участии детей в религиозно-обрядовой жизни // Этнографическое обозрение. – 1911. – № 1. – С. 43 – 56.
44. Церашковіч Т.А. Лялька беларуская. – Мн.: Полымя, 1992. – 126 с., іл.
45. Церетелли Н. Русская крестьянская игрушка. – М., 1933. – 128 с.
46. Чарняўская Л. Дзяцінныя гульні. – Вільня: Znisz, 1919. – 16 с.

47. Чекалов А. Плотницкая игрушка // Декоративное искусство СССР. – 1961. – № 8. – С. 30 – 33.
48. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Мн., 1987. – Т. 5. – С. 31 – 36.
49. Bujak Jan, Pilichowcka Bogdana Zabawki – potrzeby badawcze, problemy teoretyczne, propozycje muzcologiczne // Studia i Materialy. – Kielce. – 1995 – № 3. – S. 98 – 108; Bujak Jan Zabawki w Europie. Zarys dziejuw zainteresowań. Rozpravy habilitacyjne. – UI – 1991. – № 139. – S. 48 – 50; O genezie i zmiennych funkcjach lalki.: Zeszyty Naukowe. UI, Prace Etnograficzne. – Krakuw, 1983. – Z. 18 – 19 s.
50. Dzięgiel Leszek Futbol guzikowy. Nieznana gra dziecięca sprzed pół wieku // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. – Kelce, 1997. – Rok 1. – № 4. – S. 105 – 106.
51. Kabzińska Jwona Nie kupię wnukow tamagotchi // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. – 1997. – Rok 1. – № 4. – S. 77 – 80.
52. Kaczmarek Urszula Pedagogika zabawy – njwy styl wychowania // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. – Krakuw, 1997. – Rok 1. – № 4. – S. 5 – 14.
53. Oleszkiewicz Małgorzata Zabawki dziecka wiejskiego. Wystawa ze zbioryw Muzeum Etnograficznego im Seweryna Udzieli w Krakowie. – Krakow, 1999. – 4 s.
54. Lewińska Teresa Kolorowy świat zabawek. Zabawki ludowe w Polsce. Muzeum zabawkarstwa w Kielcach «Studia i Materiały». – Kielce, 1995. – S. 89 – 96; Piasecki E. Gry i zabawy ludowe w Polsce // Wiedza o Polsce. – Warszawa, 1992. – T. 3. – S. 120 – 134.
55. Rynkowski Marian W kraine dzieci ze «Światem Dzieci» // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. – Krakuw, 1997. – Rok 1. – № 4. – S. 63 – 72.
56. Ryszard Kantor Towarzystwo Rozwoju Zabawka rstwa. – Rreczywistość i nadzieje // Zabawy i zabawki, Kwartalnik. – Krakuw, 1997. – Rok 1. – № 1 – 2. – S. 141 – 148.
57. Zięzio Ryszard Z zagadnień wiedzy potocznej o zabawkach i zabawkarswie. Wstęp do badań // Grod spustoszony. Kontynuacja i zmiany w kulturze współczesnej wsi polskiej Materialy z Konferencji Naukowej zorganizowanej w dniach 20 – 21 kwietnia 1995 roku w Krakowie i Zubrzycy Gyrnej. – Kraków, 1995. – S. 89 – 96; Technika i modele (z zagadnień zabawek technicznych i modelarstwa – wprowadzenie do badań) – Kielce, 1995. – 56 s.; Magia Zalki. Geneza i zmiennośc funkcyi lalki / Red. Ryszard Zięzio. – Plock. – Toruń. – Kielce, 1994. – 81 s.; Zabawki Jana Puka i Stanisława Naroga szkic do badań translokacyi funkcjonalnej przedmiotuw zabawowych // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. – Krakuw, 1997. – Rok 1. – № 4. – S. 35 – 58.